УДК 81.82 : 811.161.3

*Кудлаш Марына Віктараўна*
*Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт, Гродна*

# ТЭКСТАЎТВАРАЛЬНАЯ І СТЫЛЁВАЯ ФУНКЦЫЯ ПРЫСЛОЎЯЎ У МАСТАЦКІМ ТЭКСЦЕ (НА ПРЫКЛАДЗЕ АПАВЯДАННЯ М. ЛЫНЬКОВА «ВАСІЛЬКІ»)

**Анатацыя**. *Прыслоўе як часціна мовы адрозніваецца марфалагічнай аморфнасцю і на першы погляд можа выглядаць менш прывабна, чым зменныя часціны мовы, для стваральніка мастацкага твора. Пры больш уважлівым падыходзе становіцца зразумела, што прыслоўе займае пачэснае месца сярод іншых часцін мовы, дапамагаючы ў стварэнні не толькі мастацкага вобраза, але і тэкста ў цэлым. Якасныя прыслоўі нароўні з якаснымі прыметнікамі ўдзельнічаюць у стварэнні мастацкіх апісанняў, у развіцці тэмы і выражэнні асноўнай думкі аўтара. Прыслоўі спосабу дзеяння надаюць маўленню неабходную дэталізаванасць. Прыслоўі часу дапамагаюць скласці храналагічную лінію твора. Інфармацыю аб месцах адбывання падзей даюць прыслоўі месца. Прыслоўі меры і ступені вызначаюць меру праяўлення прыметы ці якасці. Прэдыкатыўныя прыслоўі ўдзельнічаюць у выражэнні эмацыянальнага стану лірычнага героя, апісанні яго характару і ўнутранага стану. Неазначальныя прыслоўі дазваляюць апісваць неакрэсленыя ці не зусім зразумелыя прыметы. Указальныя займеннікавыя прыслоўі – важнейшы сродак міжфразавай сувязі. Мадальныя прыслоўі выражаюць разнастайныя мадальныя значэнні і выкарыстоўваюцца ў ролі пабочных слоў.*

**Ключавыя словы**: *марфалогія, прыслоўе, тэкстаўтваральная функцыя, стылёвая функцыя.*

**Abstract**. *An adverb as a part of speech is morphologically amorphous and at first glance may look less attractive than variable parts of speech for the creator of an artistic work. With a more careful approach, it becomes clear that the adverb occupies an honorable place among other parts of speech, helping to create not only an artistic image, but also the text as a whole. Qualitative adverbs, along with qualitative adjectives, participate in the creation of artistic descriptions, in the development of the topic and the expression of the author's main idea. The adverbs of the mode of action give the necessary detail to the speech. Adverbs of time help to make up the chronological line of the work. The adverbs of the place provide information about the*

*places of departure of events. The adverbs of measure and degree determine the measure of manifestation of a trait or quality. Predicative adverbs are involved in expressing the emotional state of the lyrical hero, describing his character and inner state. Indefinite adverbs allow you to describe indefinite or not entirely clear signs. Demonstrative pronominal adverbs are the most important means of inter-phrasal communication. Modal adverbs express a variety of modal meanings and are used as side words.*

***Keywords**: morphology, adverb, text-forming function, style function.*

Асноўнай функцыянальнай рысай прыслоўя з'яўляецца выражэнне «прыметы прыметы» у шырокім сэнсе. Калі прыметнік і дзеяслоў лічыць адзінкамі, якія называюць першасную па адносінах да назоўніка прымету, то прыслоўе, паясняючы дзеяслоў, прыметнік ці прыслоўе, характарызуе другасную прымету. Можа падацца, што сінтаксічна прыслоўе не мае вялікага значэння ў сказе, але ж не толькі з дзейнікаў і выказнікаў складаюцца сказы. Тым больш, што і прыслоўе можа набываць значэнне прэдыкатыўнасці і ўжывацца ў ролі галоўнага члена аднасастаўнага сказа. Ужо ў класічнай лінгвістыцы былі зроблены першыя спробы аналізу сінтаксічнай спалучальнасці прыслоўяў. Хрысіп з Солаў (III ст. да н.э.) адзначаў, што далучэнне прыслоўя дапамагае дапаўненню і больш выразнаму тлумачэнню дзеяслова. Апалоній Дыскол (II ст. н.э.) пісаў, што прыслоўе «выказвае нешта аб дзеяслоўных формах, без чаго яны не могуць скончыць думку» [1, с. 135].

«Здольнасць многіх прыслоўяў утвараць формы ступеней параўнання, формы суб'ектыўнай ацэнкі і меры якасці, багатая магчымасць мець варыянты і ўвогуле высокі словаўтваральны патэнцыял слоў гэтай часціны мовы разўам з вялікай інфармацыйнай нагрузкай на прыслоўі ў тэксце, а часта і багатай ацэначнай, эмацыянальна-экспрэсіўнай, метафарычнай функцыяй – усё разам сведчыць пра моцны выяўленчы патэнцыял і значныя тэкстаўтваральныя магчымасці прыслоўяў» [2, с. 226]. Думаецца, што было б цікава правесці аналіз ролі прыслоўяў у тэкстах мастацкага стылю, дзе заўсёды ўжываюцца разнастайныя сродкі мастацкай выразнасці.

Апавяданне Міхася Лынькова «Васількі» – адзін з самых пранікнёных і лірычных твораў айчыннай літаратуры. Яно не можа пакінуць чытача раўнадушным, таму што закранае самыя тонкія струны чалавечай душы: пачуцці маленькага хлопчыка, яго гора, перажыванні па трагічна загінулых матулі і сястрычцы, боль, нанесены кожнаму чалавеку мінулай вайной, мужнасць і самахвярнасць людзей, нават дзяцей, пад час фашысцкай навалы. Аўтар выкарыстоўвае разнастайныя мастацкія сродкі, каб перадаць стан чалавека і прыроды, выразіць душэўныя перажыванні і апісаць маштабную трагедыю, якая закранула амаль кожную беларускую сям'ю.

Прыслоўі часта выкарыстоўваюцца ў мастацкай літаратуры ў спалучэнні з іншымі часцінамі мовы, але неабходна заўважыць, што яны не з'яўляюцца асноўным сродкам вобразнасці. Прыслоўі дапаўняюць выразнасць іншых часцін мовы, найчасцей назоўнікаў і прыметнікаў. Найбольшай здольнасцю да мастацкага ўвасаблення валодаюць якасныя прыслоўі. Паясняючы дзеясловы, прыслоўі-эпітэты вызначаюць якасныя рысы дзеяння ці стану і становяцца крыніцай мастацкай выразнасці.

У апавяданні «Васількі» М. Лынькоў актыўна выкарыстоўвае якасныя прыслоўі: *звычайна*, *пацешна*, *ганарыста*, *паважна* і інш. Такія прыслоўі ўжываюцца аўтарам для апісання прыроды: *Стаяў той* ***асабліва*** *прыгожы дзень, якія бываюць* ***звычайна*** *ў канцы жніўня месяца, калі* ***даўно*** *скончана жніво, звезена жыта ў гумны і над апусцелым полем* ***дружна*** *ўзлятаюць стайкі шпакоў – прадвеснікаў блізкае восені*. Адчуваецца павольны, спакойны характар апавядання, у якім нічога пакуль не паказвае на нейкі літаратурны канфлікт. Адразу кідаецца ў вочы супрацьпастаўлене, выражанае прыслоўямі-антонімамі *асабліва – звычайна* [3, с. 7].

Пры апісанні Міколкі, які ідзе з поўным кошыкам грыбоў дамоў, выкарыстоўваюцца якасныя прыслоўі: ***ганарыста*** *гаворыць*, ***задзірыста*** *гаворыць*, ***пераможна*** *шмыгае кірпаўкай носа*, ***рэзка*** *абарваў*. Заўважана, што прыслоўі, утвораныя на аснове прыметнікаў з суфіксамі, сумяшчаюць у сабе значэнні унутранай якасці і спосабу дзеяння, таму выконваюць у тэксце функцыю дэталізацыі яго паводзін. З такога апісання становіцца зразумела, што Міколка – хлапчук з характарам, які не кідае слоў на вецер і карыстаецца аўтарытэтам у сяброў. Бусел, пра якога ідзе гаворка ў дзяцей, ***пацешна*** *ўзнімаецца*, ***паважна*** *ляціць*, як і чакае яго маленькі гаспадар. Першым бяду адчуў бусел: ***раптам*** *узляцеў угору і* ***доўга*** *лятаў, робячы ўсё большыя і большыя кругі, узнімаючыся* ***вышэй і вышэй***. Дзецям перадаецца трывога, якая ўсё больш расце: – *Галосяць... –* ***спуджана*** *сказаў адзін, і хлапчукі разбегліся, раскідаліся,* ***як спалоханыя вераб'і****, па сваіх гародах і загуменнях, кожны да свайго двара*. Разгубленасць дзяцей пісьменніку дапамагае перадаваць не толькі прыслоўе, але і параўнальны зварот, які таксама дапамагае пры апісанні [3, с. 8].

Падыходзячы да хаты, Міколка становіцца гаспадарлівым і клапатлівым: *пераскочыў праз плот, старанна абцёр ад пылу <грыбы>, васількі* ***асцярожна*** *схаваў за пазуху*. Нечаканая змена ў паводзінах хлапчука (*і* ***раптам*** *затрымцеў, як ліст, збялеў увесь*; *кошык* ***ціха*** *ўдарыўся аб зямлю*; ***бязгучна*** *рассыпаліся грыбы*) падкрэсліваецца зменамі ў прыродзе: *лес гудзіць,* ***страшна, страшна***; *хістаюцца* ***злосна*** *дрэвы*; *самая груша нахілілася* ***раптам***. Прыслоўі спосабу дзеяння разам з якаснымі адыгрываюць у апісанні важную ролю канкрэтызацыі [3, с. 9].

Партрэты і паводзіны іншых герояў апавядання таксама складаюцца з улікам ужывання якасных прыслоўяў: *Дзед Нупрэй* ***так*** *усхадзіўся з нажом, што* ***нечакана*** *аж перарэзаў грабільна і, плюнуўшы* ***злосна****, кінуў яго за плот, узрушаны чымсьці, прысеў на прызбу*. Якасныя прыслоўі дапамагаюць апісаць з'яўленне немцаў на парозе Міколкавай хаты: ***Гулка*** *бразнулі дзверы*; *Яны* ***груба*** *адштурхнулі Міколку ад ганка* [3, с. 10 – 11].

Апісанне прыроды перадае трывожны настрой твора, несумненна, не без удзелу прыслоўяў: ***Узрушана*** *шалахцела дзедаўская груша-дзічка, самотныя пчолы ляталі, кружыліся вакол спелых груш-гнілушак*; ***Трывожна*** *шчабятала дробнае птаства, і толькі сонца* ***спакойна*** *ўгравала саламяную страху, чырвоныя вяргіні пад акном* [3, с. 10].

Прыслоўі спосабу дзеяння робяць мастацкае маўленне больш выразным, канкрэтным і дэталёвым, што спрыяе большай дакладнасці і разнастайнасці апавядання: *Прад ім праходзілі ўзброеныя людзі –* ***купкамі, калонамі, у адзіночку***; *Сінімі* ***васількамі*** *адцвіталі і вочы хлопчыка* [3, с. 12 – 13].

Прыслоўі часу дапамагаюць скласці храналагічную канву твора і сінхранізаваць час падзей і час апавядання: *А* ***раніцай*** *бачылі людзі, што ён хадзіў чагосьці ў лес*; ***Потым доўга*** *распытваў старых, па якой дарозе і куды пайшлі немцы*; ***Потым*** *доўга корпаўся ў хаце, сабіраючыся ў дарогу*; *Яго бачылі* ***потым*** *у мястэчку, праз якое праходзіў бальшак*; *Ён* ***часам*** *ажыўляўся на секунду, адрываўся ад слупа, але* ***зноў*** *гарэў запылены твар, бяссільна апускаліся рукі*; ***Цяпер*** *не можа быць ніякага сумнення: гэта яны, гэта тыя, што замучылі яго маці, яго сястрычку, адабралі ад яго светлае сонца* [3, с. 7 – 12].

Разнастайную інфармацыю аб месцах адбывання падзей даюць прыслоўі месца. *Ён выстраліў некалькі разоў у Міколку і потым, нібы спужаўшыся чагосьці, хутка схаваў у кабуру задымлены рэвальвер і, ссутуліўшыся, унікаючы зірнуць у Міколкавы вочы, падаўся* ***прэч****, да тых, што расчышчалі дарогу,* ***сям-там*** *пасыпаючы яе жоўтым пяском*; ***Побач*** *ляжала яго торбачка з раструшчаным пад салдацкім ботам пеналам* [3, с. 13].

Прыслоўі часу нароўні з якаснымі ў творы з'яўляюцца важным сродкам апісання: *Усё відаць як на далоні: і кожнае дрэва на шляху, і калодзежны жураў у дальняй вёсцы, і зубчасты край лесу, і бялявы дымок* ***далёка, далёка****, дзе праходзіць чыгунка. Нават бачыш, як трапечацца зжаўцелы ліст на бліжняй бярозе, як* ***высока, высока*** *ў небе ляціць* ***няведама куды*** *самотная павуцінка* [3, с. 7].

Прыслоўі меры і ступені займаюць сваю нішу ў мастацкім тэкце, вызначаючы меру праяўлення прыметы ці якасці: ***Трошкі*** *пабойваўся яго Міколка, а любіў* ***яшчэ болей***; *Хлапчукі, аднак,* ***добра*** *ведаюць пра гэтыя заранкі; Адна рука была*

*падкручана, другой яна прыхіліла і **моцна** прыціскала да сябе, нібы абараняючы ад каго, Міколкаву сястрычку*; *Міколку стала **вельмі** горача, падкошваліся ногі* [3, с. 8 – 10].

Прэдыкатыўныя прыслоўі ўдзельнічаюць у выражэнні эмацыянальнага стану лірычнага героя, адлюстрўваюць яго характар і ўнутраны стан, даюць ацэнку яго жыццёвай пазіцыі, а таксама ўдзельнічаюць у стварэнні мастацкага вобраза, у развіцці тэмы і выражэнні асноўнай думкі аўтара. *Твару сястрычкі **не відаць***; *Хіба **можна** слёзы свае чужым людзям паказваць;? А на сэрцы было **пуста і чорна**, нібы ўзяў хто маленькае Міколкава сэрца і выціснуў з яго ўсю гарачую кроў*; *Ды каменем навісла над ім неадчэпная думка: нешта ж **трэба** зрабіць*; *Міколку стала вельмі **горача**, падкошваліся ногі*; *Нешта ж **трэба** зрабіць...*; *Міколку стала **нязручна***; *Міколка не чуў гэтых стрэлаў, яму было ўжо **ўсё роўна*** [3, с. 7 – 13].

Займеннікавыя прыслоўі часу і месца паказваюць на час і месца адбывання падзей і служаць сродкам сувязі сказаў: *Потым доўга распытваў старых, па якой дарозе і **куды** пайшлі немц;. Нехта паспрабаваў пакпіць над ім: «Ці не ў школу ты, хлопча, сабраўся, **дзе** ж віданы цяпер тыя школы»* [3, с. 11 – 12].

Пытальныя займеннікавыя прыслоўі, як і пытальныя займенннікі выконваюць важную функцыю пры пабудове дыялога і іншых пытальна-адказавых канструкцый. ***Дзе** ж падзелася, дзе памеркла гэтая радасць?*; *Ну, **чаго** ты? – не гледзячы на яго, запытаўся дзед*; *– Мам... а мам... **ну чаго ж** ты маўчыш?*; ***Нашто** табе такія самалёты?*; *А **чаму** грыміць?* [3, с. 7 – 13]

Указальныя займеннікавыя прыслоўі – адзін з важнейшых сродкаў міжфразавай сувязі. Яны дапамагаюць злучаць фрагменты тексту, пазбягаючы пры гэтым непатрэбных паўтораў: *Не хадзі **туды**... у хату*; *А перад гэтым прасачыў раз Міколка, як бацька яго разам з другімі дзядзькамі нешта ездзілі ў лес паначы і **адтуль** прыехалі з пустымі драбінамі* [3, с. 7 – 13].

Мадальныя прыслоўі дапамагаюць пры выражэнні разнастайных мадальных значэнняў і выкарыстоўваюцца ў ролі пабочных слоў: *То вы гранаты і кулямёты вазілі ў лес хаваць, **відаць**, пад тыя старыя яліны..;. Хлапчукі, **аднак**, добра ведаюць пра гэтыя заранкі* [3, с. 7 – 13].

Неазначальныя прыслоўі дазваляюць апісваць неакрэсленыя, не зусім зразумелыя прыметы або маскіруюць пазіцыю аўтара ці персанажа: *Бацька быў аж здрыгануўся **неяк**, пацямнеў тварам, але потым спакойна падышоў да Міколкі і, гледзячы яму проста ў вочы – сінія, хітрушчыя, – сурова прашаптаў некалькі слоў*; *А раніцай бачылі людзі, што ён хадзіў **чагосьці** ў лес*; *Калі **дзе-небудзь** і **калі-небудзь** ты ляпнеш якое слова, то я... я выцягну даўгі твой язык і павешу цябе на гэтай вось штуцы...*; *Яны **некуды** спяшаліся, гэтыя людзі ў нязвыклым адзенні, у нязвыклым для Міколкі абутку* [3, с. 7 – 13].

У выніку дэталёвага аналізу ўжывання прыслоўяў у апавяданні Міхася Лынькова «Васількі» можна адзначыць, што прыслоўі шырока выкарыстоўваюцца ў гэтым мастацкім тэксце. Яны ўжываюцца не толькі з мэтай вырашэння разнастайных стылёвых задач: стварэння карцін прыроды, паказу характараў герояў, іх паводзін, ацэнкі іх дзеянняў, стану, рухаў, паводзін і г.д., але і выконваюць важную тэкстаўтваральную функцыю: служаць для сувязі сказаў, частак сказаў і рэплік у дыялогу, афармлення пытальных канструкцый, указання на час, месца і прычыну адбыцця падзей.

ЛІТАРАТУРА


1. Хрестоматия по истории языкознания XIX–XX веков : сборник / сост. В. А. Звегинцев. – М. : Учпедгиз, 1956. – 458 с.
2. Сучасная беларуская мова. Марфалогія : дапаможнік / З. І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2018. – 323 с.
3. Лынькоў, М. Збор твораў у 8-мі т. / М. Лынькоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982 – 1985. – Том 2: Апавяданні і нарысы, 1942 – 1975. – 1982. – 542 с.